**В.М. Глубачэнка**

## *Імправізацыя на баяне*

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі імправізацыя займае далёка не апошняе месца сярод іншых формаў музіцыравання на баяне. Дзе б ні навучаўся баяніст, дзе б ён ні працаваў — ўсюды ён непазбежна сутыкаецца з гэтай з'явай. Што ж такое "імправізацыя", і ў якіх формах яна можа існаваць у дзейнасці баяніста?

Пад імправізацыяй часцей за ўсё разумеюць самастойны, найбольш старажытны від музычнай творчасці — сачыненне музыкі непасрэдна ў момант яе выканання. Імправізацыя — таксама і сродак пазнання свету, мастацкай рэчаіснасці, самапазнання. Гэта і спосаб пераўтварэння жыцця, самасвядомасці. Імправізацыя можа разглядацца і як гульня з бясконцым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мноствам камбінацый і варыянтаў гукавога рашэння, а можа — як сродак камунікацыі паміж партнёрамі-імправізатарамі, паміж імправізатарам і аўтарам імправізуемай тэмы, імправізатарам і слухачамі. Усе гэтыя значэнні імправізацыі даволі дакладна і рознабакова характарызуюць дадзенае складанае і вельмі інтрыгуючае паняцце, садзейнічаюць раскрыццю яго сутнасці.

Нам хацелася б прапанаваць уласны варыянт вызначэння імправізацыі як непасрэднага музычнага выказвання. Па-першае, паняцце непасрэдна сведчыць аб тым, што музыкант-імправізатар для апрадмечвання сваіх мастацка-вобразных пачуццяў і думак не мае патрэбы ў пасрэдніку, чаго нельга сказаць пра кампазітара. Творчасць апошняга прадугледжвае наяўнасць асобы выканаўцы — музыканта, які мае справу з нотным тэкстам. Апошні (тэкст) ёсць не што іншае, як апасродкаванае выяўленне кампазітарскай задумы. Па-другое, пад музычным выказваннем трэба разумець вышэйшы ўзровень авалодання мовай музыкі (пасля яе разумення, чытання і інтэрпрэтацыі аўтарскіх музычных тэкстаў). Паняцце "музычнае выказванне" аб'ядноўвае ў сабе самыя розныя па мастацкай якасці прадукты дзейнасці музыканта — ад самых наіўных па змесце і прымітыўных па форме дзіцячых імправізацый да самых дасканалых твораў вядомых майстроў. Яно таксама можа абазначаць нейкі ўрывак, фрагмент або фактурны элемент у форме цэлага, звязаны з актыўнасцю суб'екта дзейнасці. Інакш кажучы, паняцце "музычнае выказванне" функцыяніруе безадносна да зместу, маштабу і мастацкай каштоўнасці імправізацыі.

Каб дакладна вызначыць месца і ролю імправізацыі ў творчасці баяніста, неабходна разгледзець асноўныя накірункі яго прафесійнай дзейнасці, такія як канцэртнае выканальніцтва, акампанемент, педагагічная праца, удзел у розных музычных ансамблях. Не менш важна выявіць тыя накірункі і стылі музыкі, у межах якіх разгортваецца дзейнасць баяністаў, з пункту гледжання праяўлення ў іх імправізацыйнага пачатку.

Разгляд асноўных формаў прафесійнай дзейнасці баяніста пачнем з пошуку месца імправізацыі ў мастацтве канцэртнага выканаўцы. Адзначым, што ў шматлікіх краінах свету, у тым ліку ў Заходняй Еўропе, выступленне баяніста-імправізатара цяпер разглядаецца як звычайная з'ява. Там існуюць шматлікія прыватныя і дзяржаўныя навучальныя ўстановы, у якіх асноўны акцэнт робіцца на засваенні менавіта

імправізацыі. У апошні час даволі шырокае распаўсюджванне атрымала правядзенне конкурсаў і фестываляў, адным з галоўных патрабаванняў якіх з'яўляецца музычная імправізацыя. Да гэтага трэба дадаць, што ў некаторых музычных накірунках кампазітарскія творы прадугледжваюць і нават патрабуюць ад выканаўцы праяў імправізатарскіх магчымасцей. Мы маем на ўвазе, напрыклад, старажытную поліфанічную і класічную музыку, у якой аўтары даволі часта пакідаюць месца для творчых праяў выканаўцы. Гутарка тут ідзе пра імправізацыю прэлюдый, генерал-баса, кадэнцый і інш. Тое ж можна сказаць і пра шматлікія прыёмы сучаснай акадэмічнай музыкі, такія як музыка тэмбраў, санарыстыка, пуантылізм, пра народную музыку і, вядома ж, пра эстраду і джаз — накірункі, якія зараз з'яўляюцца найбольш моднымі і якія развіваюцца асабліва хутка.

Баяніста-акампаніятара, які не валодае навыкамі імправізацыі, сёння нельга лічыць паўнаважным музыкантам-прафесіяналам. Практычна любая форма яго дзейнасці — з'яўляецца ён акампаніятарам харавога калектыву ці ансамбля, працуе ў сферы харэаграфіі, акампаніруе салісту-вакалісту або інструменталісту, абслугоўвае культурныя мерапрыемствы — у той ці іншай меры патрабуе ад музыканта пэўных ведаў і практычных уменняў у галіне імправізацыі.

Аб тым, якое месца займае музычная імправізацыя ў дзейнасці баяніста-выкладчыка, лепш за ўсё сведчыць той факт, што адной з галоўных тэндэнцый сучаснага музычнага выхавання ў свеце прызнана тэндэнцыя да павелічэння ролі творчага музіцыравання ці музычна-прадуктыўнай дзейнасці ў фарміраванні асобы навучэнца. Навукова-метадычныя і практычныя дасягненні ў гэтым накірунку айчынных і замежных даследчыкаў і педагогаў сведчаць аб тым, што заняткі па імправізацыі значна павышаюць эфектыўнасць вучэбнага працэсу, садзейнічаюць узнікненню трывалай зацікаўленасці музычнай справай, абуджаюць творчы патэнцыял вучня і актыўна спрыяюць яго рэалізацыі. На вялікі жаль, на сённяшні дзень нельга канстатаваць, што імправізацыя ў асяродзі выкладчыкаў-баяністаў краіны займае належнае месца. Педагогаў, якія вучаць імправізаваць, налічваецца вельмі мала, і ўсе яны, як і 20 — 30 гадоў таму, называюцца педагогамі-наватарамі. Гэта вельмі сумная акалічнасць, калі зыходзіць з таго, што ў развітых краінах свету выкладанне імправізацыі даўно ўжо стала звычайнай з'явай.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Адносна спецыфікі работы баяніста-ансамбліста можна смела сказаць, што ў апошні час у калектывах, якія прытрымліваюцца фальклорнага накірунку, імправізацыі адводзіцца даволі значная роля. Удзельнікі часта атрымліваюць партыю ў выглядзе схемы ці ўмоўнага абазначэння. Далей ад іх патрабуецца напоўніць выконваемы твор жывым гучаннем, знайсці выразную фігурацыйную лінію, цікавыя кантрапункт ці падгалосак. Акрамя калектываў падобнага фальклорнага накірунку баян зараз даволі шырока распаўсюджаны ў ансамблях, якія выконваюць творы ў эстрадным або джазавым стылях. А імправізацыі ў такой музыцы, як мы ведаем, заўсёды ўдзялялася асаблівая ўвага.

Такім чынам, імправізацыя на баяне ў сучасных умовах з'яўляецца вельмі неабходнай формай музіцыравання, і перад баяністам, які не валодае адпаведнымі навыкамі, вельмі часта будуць узнікаць усялякія цяжкасці. Ён будзе адчуваць стан дыскамфорту і пастаянна сумнявацца ў сваёй прафесійнай кампетэнтнасці. Як мы ўбачылі, практычна любы накірунак дзейнасці баяніста прадугледжвае ў той ці іншай ступені наяўнасць імправізатарскіх здольнасцей. З-за канструкцыі інструмента, яго кампактнасці, зручнасці ў выкарыстанні, а таксама дзякуючы яго вельмі шырокім тэхнічным і мастацкім магчымасцям баян на сучасным этапе актыўна выкарыстоўваецца ў розных накірунках музыкі. Асноўнымі з іх можна лічыць традыцыйную народную, поліфанічную, акадэмічную і лёгкую музыку са шматлікімі разнавіднасцямі і плынямі.

Спынімся крыху на педагагічных праблемах імправізацыі. Іх шмат. Нягледзячы на разуменне неабходнасці і карысці займання імправізацыяй, педагогі-баяністы вельмі марудна і неахвотна звяртаюцца да адпаведных метадаў. Гэта можна растлумачыць наступным чынам. Да імправізацыі часцей за ўсё ставяцца як да другаснага, не абавязковага навыку. Дысцыпліны, якая прадугледжвала б развіццё такіх навыкаў, нават няма ў вучэбных планах спецыяльных навучальных устаноў. Зразумела, пачынаць развіваць падобныя навыкі трэба з самых першых крокаў. Выкладчыкі ж дзіцячых музычных школ справядліва адзначаюць: каб выкладаць асновы імправізацыі, трэба самому ўмець імправізаваць. А калі гэтаму іх ніхто і нідзе не вучыў, то аб якой імправізацыі можа ісці размова? Кола замыкаецца — ніхто ні за што не адказвае.

На наш погляд, заняткі па імправізацыі павінны стаць неад'емным кампанентам сістэмы музычнай адукацыі ва ўсіх яе звёнах. Для гэтага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходна ўключыць яе ў вучэбныя планы як спецыяльную дысцыпліну, арыентаваную на азнаямленне з асновамі імправізацыі або з паглыбленым яе вывучэннем. У залежнасці ад пастаўленых задач неабходна распрацаваць рабочыя праграмы з комплексам патрабаванняў адпаведнага накірунку. Пажадана было б часцей праводзіць навуковыя канферэнцыі, лекцыі, круглыя сталы па праблемах развіцця навыкаў імправізацыі, актыўней прапагандаваць перадавы вопыт. Магчыма прыняць меры па арганізацыі канцэртных і паказальных выступленняў выдатных баяністаў-імправізатараў, а можа, і падумаць наконт правядзення адпаведных фестываляў ці конкурсаў. Мы ўпэўнены, што закранутая намі тэма хвалюе шматлікіх музыкантаў і даследчыкаў. Спадзяемся, што імправізацыя на баяне ў хуткім часе выйдзе на якасна новы ўзровень і стане неад'емнай часткай палітры выразных выканальніцкіх сродкаў баяніста XX стагоддзя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ